**А. В. ЗІНЬКЕВІЧ**,
настаўніца вышэйшай катэгорыі гімназіі № 2 г. Наваполацка

# ЯКУБ КОЛАС. «ДЗЯДЗЬКА-КУХАР»

## (урок у VII класе)

М э т ы: дапамагчы вучням асэнсаваць ідэйны змест твора, правесці назіранні і выявіць прыёмы стварэння літаратурнага героя, вызначаць іх мастацкую ролю, садзейнічаць фарміраванню медыякампетэнцый вучняў у час працы з рознымі крыніцамі інфармацыі.

З а д а ч ы: садзейнічаць выпрацоўцы ўмення характарызаваць вобраз літаратурнага героя праз яго ўчынкі; на аснове зместу твора выхоўваць у вучняў пачуццё роднасці, духоўнай еднасці з блізкімі людзьмі, павагу і ўдзячнасць родным за іх любоў і клопаты.

Т ы п  у р о к а: вывучэнне новага матэрыялу.

Т э х н а л о г і я: развіццё крытычнага мыслення праз пісьмо і чытанне.

А б с т а л я в а н н е: вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для VII класа, мультымедыяпрэзентацыя, каляровы партрэт Якуба Коласа, выстава кніг пісьменніка і ілюстрацыі мастакоў да яго твораў.

Э п і г р а ф: Усе дарослыя спачатку былі дзецьмі, толькі мала хто з іх пра гэта помніць *(Антуан дэ Сэнт-Экзюперы)*.

### Ход урока

**I. Арганізацыйна-матывацыйны момант. Падрыхтоўка да ўспрыняцця тэмы ўрока.**






Н а с т а ў н і к. Добрае вырастае толькі на добрай глебе, калі жывіцца гаючай вадой. Такой глебай, грунтам для кожнага з нас з'яўляецца сям'я, а жывой вадой — навучанне і прыклад старэйшых. Дома вы прачыталі ўрывак «Дзядзька-кухар» з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». (*Пастаноўка мэты ўрока.*) Сёння мы больш падрабязна спынімся на майстэрстве Якуба Коласа ў абмалёўцы характару дзядзькі Антося, паглыбім веды пра лад жыцця тагачасных беларусаў. Для таго каб пачаць працаваць над урыўкам, успомнім падзеі, якія апісвае аўтар, і выканаем літаратурны дыктант.

**Заданне.** Самастойна дапішыце выказванне або аднавіце слова на месцы пропуску.

1. Аўтарам паэтычных твораў «На рэчцы», «Дарэктар», «Дзядзька-кухар» з'яўляецца... *(...Якуб Колас)*, сапраўднае прозвішча якога... *(...Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч)*.

2. Гэта ўрыўкі з паэмы Якуба Коласа... *(...«Новая зямля».)*

3. Які матэрыял пакладзены ў аснову паэмы «Новая зямля»? *(Жыццё сям'і паэта.)*

4. Галоўным героем раздзела «Дзядзька-кухар» з'яўляецца... *(...Дзядзька Антось.)*

5. Дзеці любілі Антося за... *(...Шчырасць, чуласць, вынаходлівасць, дабрыню.)*

6. Якія прыёмы выкарыстоўвае Якуб Колас, калі паказвае працэс прыгатавання дзядзькам клёцак? *(Гумар, іронію, камізм.)*

7. Як вы разумееце значэнне слова «штукар»? *(Майстар.)*

Агучванне вынікаў працы.

Н а с т а ў н і к. Працягваем нашу працу і звернемся да эпіграфа. Як вы разумееце словы Антуана дэ Сэнт-Экзюперы? *(Адказы вучняў.)*

- Ці быў у вашым дзяцінстве такі чалавек, якім для Костуся, яго братоў і сясцёр быў дзядзька Антось? *(Адказы вучняў.)*
- На ваш погляд, якімі павінны быць узаемаадносіны дарослых і дзяцей? Запішыце пяць-шэсць самых значных для вас паняццяў.

**Словы для даведкі:** чуласць, добразычлівасць, гумар, нянавісць, хлусня, кемлівасць, знаходлівасць, шчырасць, даверлівасць, абыякавасць, эгаізм, чэрствасць, дабрыня, любоў.

Агучванне вынікаў працы.

**Выснова.** Узаемаадносіны дзядзькі Антося з дзецьмі таксама былі даверлівымі, шчырымі, сяброўскімі.

**II. Аперацыйна-пазнавальны этап.**

Настаўнік. Пяройдзем да разгляду твора. Папрацуем з тэкстам і высветлім, якім жа быў дзядзька Антось на самай справе. Вызначым рысы натуры галоўнага героя праз аўтарскую характарыстыку.

• Знайдзіце ў творы радок пра тое, што дзядзька Антось быў добры, любіў дзяцей. *(«Прыхілен дзядзька быў да дзетак...».)*

• Дзядзька Антось валодаў педагагічным талентам? *(«Ён быў настаўнікам, суддзёю...».)*

• Як ён трымаўся поруч з дзецьмі і ставіўся да іх? *(«Яшчэ замецьце, што з малымі // Ён размаўляў, як са старымі, // І з імі радзіўся, спрачаўся — // Як ройны з ройнымі трымаўся!»)*

• Якімі талентамі валодаў дзядзька Антось? *(Ён валодаў талентам апавядальніка: «А дзядзька ўсё табе пакажа. // Цікавасць усю тваю развяжа...» Ён быў вынаходлівым, здольным да розных умельстваў: «І дзядзька майстар быў на штукі // І быў механік на ўсе рукі...»)*

**Выснова.** Такім чынам, дзядзька Антось займаў у жыцці і выхаванні дзяцей значнае месца. Дзеці любілі яго за ўвагу да іх, таленавітасць, вынаходлівасць.

Фізкультхвілінка.

Настаўнік. Прадоўжым нашу працу. Якія ж рысы характару выяўляюцца ў асобе дзядзькі Антося? Якія дзеянні і ўчынкі ён робіць, каб зацікавіць дзяцей? Давайце і паспрабуем гэта выявіць з дапамогай табліцы.

**Заданне.** Запішыце дзеянні і ўчынкі дзядзькі Антося, праз якія выяўляюцца яго рысы характару.

| Рысы характару | Дзеянні, учынкі |
|---|---|
| Эстэтычны густ | Падарожжа ў Ліпава (мог выбраць прыгожую мясціну, вызначаўся ўменнем адчуваць прыроду). |
| Назіральнасць | Падарожжа ў Ліпава (здольны заўважаць хараство ў навакольных краявідах, праяўляў цікавасць да ўсяго жывога на зямлі). |
| Дабрыня, прыхільнасць да дзяцей | Задавальняў цікавасць дзяцей да навакольнага свету, цярпліва слухаў іх пытанні, ахвотна адгукаўся на іх просьбы. |
| Вынаходлівасць | Умеў рабіць розныя рэчы, быў механікам, мастаком, апавядальнікам, кулінарам. |

**Выснова.** Для таго каб зацікавіць дзяцей, дзядзька Антось не шкадуе часу: апавядае ім казкі, наладжвае вандроўкі, адгукаецца на іх просьбы, адказвае на пытанні і інш. Такім чынам, Якуб Колас паказаў дзядзьку Антося як старэйшага сябра дзяцей, мудрага педагога, таленавітага апавядальніка, майстра на ўсе рукі.



Настаўнік. А як увасобілі вобраз гэтага персанажа мастакі? Якімі сродкамі карысталіся, каб стварыць вобраз дзядзькі Антося?

Дэманструецца слайд з рэпрадукцыяй Васіля Шаранговіча «Дзядзька-кухар». — Рэжым доступу: *http://delaemvmeste.by/galereya-vasiliy-sharangovich/)*

**Творчая работа.**

**Заданне.** Падбярыце вобразныя азначэнні да слоў, карыстаючыся табліцай.

| | |
|---|---|
| Твар | Вочы (выраз пачуццяў) |
| Бровы | Вусны |
| Нос | Рот |
| Вочы (форма) | Фігура |
| Вочы (колер) | Пастаць |

**Вобразныя азначэнні**

| | |
|---|---|
| Твар | Круглы, авальны, трохвугольны, квадратны, трапецападобны |
| Бровы | Кароткія, доўгія, вузкія, шырокія, прамыя, гарызантальныя, дугападобныя, скошаныя наверх, ламаныя, скошаныя ў сярэдзіну, нізкія, рассунутыя, высокія, асіметрычныя |
| Нос | Вузкі, тонкі, высокі, прамы, шырокі, тоўсты, скрыўлены, тупы, востры, круглы |
| Вочы (форма) | Круглыя, авальныя, вузкія, трохвугольныя |
| Вочы (колер) | Сінія, блакітныя, шэрыя, карыя, цёмныя, чорныя, выцвілыя |
| Вочы (выраз пачуццяў) | Добрыя, ясныя, закаханыя, ласкавыя, разумныя, шчырыя, строгія, суровыя, хітрыя |
| Вусны | Тонкія, тоўстыя, падціснутыя, выпуклыя |
| Рот | Малы, куткі гарызантальныя, вялікі, куткі прыўзнятыя, куткі апушчаныя |
| Фігура | Стройная, худая, мажная |
| Постаць | Сутулаватая, прысадзістая |

*(У выніку атрымаецца падрабязнае апісанне знешняга выгляду дзядзькі Антося.)*

Настаўнік. Скажыце, калі ласка, а які самы цікавы, займальны і запамінальны эпізод у творы? *(Кухарскі эксперымент дзядзькі Антося.)*

Давайце перанясёмся ў канец XIX ст. і паспрабуем клёцак, звараных дзядзькам Антосем.

Прагляд эпізоду «Дзядзька-кухар» з мастацкага фільма «Новая зямля» (1982). — Рэжым доступу: *https://www.youtube.com/watch?v=pd5LHvcAWsE.*

- Ці чакалі вы такога фіналу пры гатаванні дзядзькам клёцак? *(Адказы вучняў.)*
- Дык мо дзядзька Антось зусім не майстар-штукар? *(Канечне, майстар. Жаданне зрабіць для дзяцей адкрыццё, прынесці ім хвіліны радасці падштурхоўвалі дзядзьку Антося да эксперыментаў, можа, не заўсёды ўдалых, але ўжо сам працэс прыносіў дзецям задавальненне, незалежна ад вынікаў.)*
- У чым падабенства пры ўвасабленні вобраза дзядзькі Антося? *(Гэта, у першую чаргу, адносіны да дзяцей, каларытная мова, гумар.)*

**III. Кантрольна-рэфлексійны этап. Выстаўленне адзнак.**

Настаўнік. Сёння мы жывём у імклівым і зменлівым свеце. Якімі ўменнямі, на вашу думку, павінны валодаць дарослыя, каб завяваць аўтарытэт у дзяцей? *(Адказы вучняў.)*

Мы падрабязна пазнаёміліся з вобразам дзядзькі Антося, убачылі, што ён быў сапраўдным майстрам, таленавітым чалавекам.

Прапаную кожнаму з вас запоўніць табліцу **«Плюс-мінус-цікава»**.

| + | — | Цікава |
|---|---|---|
| Усё на ўроку спадабалася, інфармацыя і формы працы выклікалі станоўчыя эмоцыі. | Усё не спадабалася, было нецікавым і незразумелым. | Усе факты цікавыя, яшчэ хацелася б даведацца новае па гэтай тэме. |

*(Гэты прыём рэфлексіі дазваляе зірнуць на ўрок вачамі вучняў, прааналізаваць яго з пункту гледжання каштоўнасці для кожнага ўдзельніка вучэбнага працэсу.)*

Настаўнік. Адносіны да родных людзей — галоўны крытэрый чалавечнасці. Па тым, ці прыслухоўваюцца маладыя да бацькоўскай думкі, ці паважліва яны ставяцца да бацькоў і блізкіх людзей, мяркуюць пра іх выхаванасць. Здаўна ў нашым народзе лічылі: «Бацька і маці ад Бога ў хаце, хто іх зневажае, дабра не знае». Мне падаецца, што адносіны павінны будавацца з улікам магчымасцей, інтарэсаў і асаблівасцей адно аднаго. У дарослых ёсць тое, чаго няма ў дзяцей, але дзеці валодаюць тым, чаго няма ў нас. Разам нам удаецца аб'яднаць убачанае і адчутае, знайсці, так бы мовіць, інтэграванае светабачанне і светаадчуванне. Спадзяюся, вашы ўзаемаадносіны з дарослымі будуць менавіта такімі, пабудаванымі на даверы і шчырасці.

**IV. Дамашняе заданне** *(на выбар).*

1. Скласці план урыўка «Дзядзька-кухар».
2. Падрыхтаваць аргументаваны адказ па тэме «Прыгажосць і прывабнасць унутранага свету дзядзькі Антося».
3. Намаляваць ілюстрацыю да твора.